**Вараб'ёва В.А. (Мінск)**

## Апазіцыя «дзень – ноч» у паэзіі Максіма Багдановіча

Выдатны прадстаўнік нацыянальнай культуры М. Багдановіч пражыў кароткае, але надзвычай яркае жыццё. У яго творчасці вялікае месца належыць вобразу часу. Амаль у кожным вершы сустракаем часавыя вобразы, гэта поры года: зіма («Здароў, марозны звонкі вечар! / Здароў, скрыпучы, мяккі снег!» [1, с.72]), вясна («Праясняецца пагода, / Бо вярнулася вясна» [1, с.73]), лета, восень; гэта этапы жыцця: нараджэнне («Хрэсьбіны лесуна»), маладосць («Першая любоў»), старасць («Старасць»), смерць («Смерць прыйшла ужо ка мне…» [1, с. 221]); перыяды сутак: ноч («Ты ночкаю каляднай варажыла» [1, с. 220]), вечар («Вечар ціхі, вечар просты / Ад усходу ўжо ідзе» [1, с. 226]), раніца («Але блізка гадзіна утра – / Разгарнецца за лесам зара» [1, с. 206]), дзень («Напілося сонца са крыніц сцюдзёных, / Усцягнула ў вышу з іх ваду, як пар» [1, с. 116]) і інш. Усе пералічаныя вобразы не толькі звязаны з рэаліямі жыцця, выкарыстоўваюцца ў пейзажных замалёўках, але і маюць сімвалічны змест.

Адным з самых распаўсюджаных у паэзіі М. Багдановіча выступае вобраз ночы, якая адухаўляецца, напаўняецца колерам, рукам: «Ціха па мяккай траве сінявокая ноч прахадзіла»; «Ноч плыве над зямлёй, сее росы»; «Чорнай рызай усё пакрывае, / Пылам зор небасхіл абсявае». Яна заўсёды выяўляецца праз зрокавыя прыродныя аб'екты – зоркі і месяц. Месяц можа быць розны па форме: «круглы», «маладзік», «месяца рожкі», можа адрознівацца колерам: «чырвона-жоўты», «бледна-сіні», «белы», можа быць «сумным», «заплаканым», «маркотным». Зоркі ў М. Багдановіча таксама розныя: адны «гараць і ўзрываюцца ў небе далёкам», другія – водзяць карагоды ці ствараюць «узор прыгожы». Адна з іх «быццам змей залаты зіхаціць / і стухае у небе глухім», другая – «светлыя згадкі з сабой прывяла». У кожнай з іх свае, толькі ёй вядомыя, шлях і арбіта, якія ніяк не залежаць ад чалавека, ад яго жаданняў.

Начное неба вабіць паэта сваёй недасягальнасцю і неабсяжнасцю, халоднай глыбінёй і таямнічай велічнасцю, адсутнасцю чалавечых перажыванняў, але трапіць туды можна толькі ў марах: «Там не трэба ні шчасця, ні ласкі, / Там няма ні нуды, ні клапот, / Ты – царэвіч цудоўнае казкі, / Гэта хмара – дыван-самалёт!» [1, с. 74].

Адухаўляючы месяц і зоркі, паэт не толькі любуецца імі як касмічнымі аб'ектамі, ён робіць іх жывымі сведкамі зямных падзей. Яны, чужыя і далёкія, «бестрывожна» сочаць за ходам жыцця і не ўмешваюцца ў яго, застаючыся вялікай таямніцай для чалавека: «І гэтак маркотна і пільна / На край наш нядольны глядзяць…/ Што ж чуюць яны там, што бачаць? / Чаго ўсё дрыжаць і дрыжаць?» [1, с. 106]. Ноч прыцягальная для паэта і адпаведным станам – цішынёй. Халодная і беспрытульная цішыня неба супрацьстаіць жывой і пяшчотнай цішыні зямлі: «Жыццё чуваць з усіх старон, / Жыццём напоўнены ўвесь мрок» [1, с. 61]. Навучыўшыся разумець цішыню, можна пачуць, «як расце трава», як «вецярок прыдарожную грушу / Ледзьве чутна варуша-калыша», або як «ціха срэбрам грукае крыніца». Прырода ніколі не спыняе сваёй хады, яна і ўдзень, і ўначы працягвае жывы рух, пастаянны, вечны. У гэтым зямная прырода збліжаецца з нябеснымі стыхіямі, утвараючы з імі гарманічнае адзінства. Далучыцца да велічнага свету быцця і адчуць яго

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

хараство можна толькі «з прыродай зліўшыся душой», чаго і дасягае М. Багдановіч.

У стане гарманічнага суладдзя з прасторай паэт можа бачыць вобразы «зачараванага царства»: Лесуна, Русалку, Змяінага цара, Вадзяніка. У кожнага з іх сваё жыццё, але для кожнага ноч – пара ўладарства, самы спакойны і бяспечны час: «Нам не трэба ні ад чога / Ноччу абароны» [1, с. 56]. Аднак чароўны свет цэласны і гарманічны толькі на першы погляд. Ён жыве па законах прыроднага адзінства, а гэта значыць, пазбаўлены рэзкіх перамен і ўвогуле баіцца зменлівасці, развіцця, якія для насельнікаў «зачараванага царства» звязаны са смерцю: «Зрубалі бор – лясун загінуў» [1, с. 53].

Насельнікі чароўнага свету баяцца дня, хаваюцца ад яго туды, дзе «холад, глыбіна, цішына». Прадчуванне смерці робіць іх абыякавымі да плыні часу, як старога адзінокага лесуна, у якога «ўсё знікла – і ўдаласць, і сіла». Жыхары царства (Вадзянік, Лясун, Русалка) знаходзяцца ў стане пастаяннага сну, з якога няма выйсця. Жыццё і сон у гэтым свеце не раздзелены. Жыццё ў сне – агульны стан «зачараванага царства». Чалавек у такім свеце – чужынец. Прывідны свет для яго небяспечны, бо можна назаўсёды застацца у царстве мрояў, сну і забыцця. Чалавек падпарадкоўваецца іншым законам. У яго жыцці дзень і ноч палярызуюцца. Дзень – гэта час жыцця, актыўных дзеянняў, творчасці, натхнення. Толькі дзённае святло можа раскрыць чалавеку сапраўдныя каштоўнасці прадмета ці з'явы, каб даць ім аб'ектыўную ацэнку: «Не блішчыць у час змяркання і ў глыбокай цемні ночы / Дыямент каштоўны, / Але белым днём красою нам чаруе, вабіць вочы / Блеск яго цудоўны» [1, с. 115].

Дзень спрыяе творчым пошукам і натхненню. У чалавека абвастранае пачуццё імгненнасці свайго жыцця, таму трэба спяшацца рэалізаваць сябе ў адведзены час. Паэт папярэджвае: «Жывеш не вечна, чалавек, – / Перажыві ж у момант век!» [1, с. 121]. М. Багдановіч настройвае на самаадданую, плённую, шчырую і сумленную працу на карысць чалавека і грамадства. Самаадданасць чалавека-ствaральніка абавязкова будзе ацэнена нашчадкамі.

Ноч у чалавечым свеце таксама іграе не менш важную ролю. Гэта, найперш, час адпачынку пасля пленнага дня: «Досі ўжо працы, бо сонца зайшло» [1, с. 79]. Яна выступае мяжой паміж мінулым, учарашнім і будучым, заўтрашнім, становіцца перыядам асэнсавання вынікаў кожнага пражытага дня, яго ацэнкі і стварэння праграмы на дзень наступны. Для паэта «ўчора» і «заўтра» аднолькава дарагія, таму што яны напоўнены творчым пошукам: «І роўна мілымі зрабіцца / Здалеюць яркі блеск і цень, / Той дзень, што мае нарадзіцца, / І зніклы дзень» [1, с. 60].

У творах М. Багдановіча ёсць спалучэнне «вечная ноч», якое можна разумець як заканчэнне жыцця, смерць чалавека. Па-рознаму можна правесці і адзін дзень, і цэлае жыццё. «Вечная ноч» можа палохаць толькі таго, хто не бачыў сонца, хто не жыў поўным і яркім жыццём. Пераходу ў вечнасць не пазбегне ніхто. Умовай спакойнага адыходу паэт лічыць рэалізацыю жыццёвай праграмы кожным канкрэтным чалавекам: «І ў напружэнні паўнаты / Свайго шырокага жыцця / Без болю, ціха зойдзеш ты / Ў краіну забыцця» [1, с. 121]. Ноч у паэзіі М. Багдановіча – анталагічны вобраз. Праз апазіцыю «дзень – ноч» паэт выходзіць на праблему прызначэння чалавека і сэнсу чалавечага жыцця.

**Літаратура**

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

Багдановіч, М. Поўны збор твораў : у 3 т. / М. Багдановіч. – Мінск, 1992–1995. – Т. 1 : Вершы, паэмы, пераклады, наследаванні, чарнавыя накіды. – 1992.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ